**Ю. Мароз**

# ПРАБЛЕМА МІЖНАРОДНАГА ПРЫЗНАННЯ БНР

Пачатак XX стагоддзя – час, калі з карты Еўропы знікалі старыя імперыі, на месцы якіх з'яўляліся новыя дзяржавы. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі адным з першых крокаў бальшавікоў з'яўлялася прынясце Дэкларацыі правоў народаў Расіі, згодна з якой абвяшчалася права на самавызначэнне і будаўніцтва самастойных краін. Гэты дакумент стаў своеасаблівым каталізатарам беларускага нацыянальнага руху да стварэння Беларускай Народнай Рэспублікі, пасля абвяшчэння якой перад урадам паўстала шмат задач, звязаных з пабудовай фундамента дзяржаўнасці. Адной з найважнейшых было дасягнуць прызнання БНР на міжнароднай арэне як незалежнай дзяржавы.

Перш за ўсё інфармацыя аб утварэнні БНР была прадстаўлена нямецкаму ўраду, але самастойнасць беларускай краіны прызнана не была: Германія ставілася да Беларусі як да часткі Савецкай Расіі і без згоды ўрада Леніна не магла прызнаць БНР. Справа была ў тым, што згодна з Берасцейскім мірам, немцы абавязваліся не падтрымліваць ніякіх новых дзяржаўных утварэнняў.

Палітычна найбольш блізкай да наваствораной беларускай дзяржавы была Украінская Народная Рэспубліка, з боку якой была аказана фінансавая дапамога, у Кіеве адкрылася Беларуская гандлёвая палата, а таксама былі прызначаны консулы. У той самы час, калі беларуская дэлегацыя знаходзілася ў Кіеве, прадстаўнікі Віленскай Беларускай Рады пачалі перамовы з літоўскай Тарыбай. На жаль, ні Літва, ні Украіна, атрымаўшы падтрымку ад нямецкага ўрада, не змаглі на афіцыйным узроўні прызнаць БНР: такім чынам яны нарушылі б нямецка-бальшавіцкую дамову і развязалі канфлікт са сваім саюзнікам.

Цікавую палітыку падчас мірнай канферэнцыі ў Парыжы праводзілі палякі: яны разглядалі магчымасць незалежнасці Усходняй Беларусі, што была занятая бальшавікамі, але памкненні да незалежнасці жыхароў Віленшчыны і Гародзеншчыны, тэрыторый, на якія яны прэтэндавалі, стараліся тармазіць.

Калі казаць яшчэ пра адну суседку Беларусі – Латвію, то гэтая краіна прыхільна ставілася да ідэі беларускай дзяржаўнасці. У верасні 1919 г. у Рызе пачала працаваць Беларуская вайскова-дыпламатычная місія, а таксама было адкрыта консульства. Але афіцыйнага прызання беларускага ўрада не адбылося.

БНР не расцэньвалі як незалежную дзяржаву і прадстаўнікі краін Антанты, якія толькі пачалі даведвацца пра існаванне беларусаў.

Да сённяшняга дня ідуць спрэчкі на тэму прызання БНР іншымі краінамі. Калі разглядаць прынясце існавання дзяржавы *de facto*, то можна казаць пра тое, што на такім узроўні БНР падтрымалі Украіна, Літва і Латвія. На жаль, атрымаць найвышэйшую ступень прызнання, *de jure*, БНР не ўдалося. Але нягледзячы на тое, што дасягнуць гэтай мэты не атрымалася, быў зроблены вельмі важны крок: упершыню за ўсю гісторыю беларускага народа была здейснена рэальная спроба стварэння незалежнай беларускай дзяржавы.